Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-12-11

# На тым тыдні...

✓ **29 лістапада** ў мінскім Цэнтры сучасных мастацтваў адбыліся **Публічныя папярэднія прагляды IV Міжнароднага фестывалю кароткаметражнага кіно «Cinema Perpetuum Mobile»**. У новай праграме – дваццаць шэсць фільмаў розных жанраў з дванаццаці краінаў свету, у тым ліку крымінальная камедыя з Францыі ў стылі Гая Рычы, фільм з Бразіліі на тэму экаактывізму ў Лацінскай Амерыцы, а таксама трагічная меладрама з Астравоў Кука.

✓ **2 снежня** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася **юбілейная выстаўка Андрэя Смаляка «Жыццё. Жывапіс. Каханне»**, ганаровага акадэміка Еўрапейскай акадэміі мастацтваў, сябра Беларускага саюза мастакоў. У экспазіцыі прадстаўлена больш за сто жывапісных прац, якія адлюстроўваюць усе этапы творчасці мастака, у тым ліку і арыгіналы ўнікальнага аўтарскага праекта «Ажылыя карціны», а таксама новыя творы.



✓**3 снежня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя выдання «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя»** ў чатырох тамах – фундаментальнага даследавання літаратурнага працэсу нашай краіны. Унікальная, маштабная па сваёй навуковай значнасці праца створаная вялікім калектывам аўтараў і рэдактараў на базе філіяла Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы – Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

У межах імпрэзы адбылося адкрыццё выстаўкі «Літаратурная спадчына XX стагоддзя», падрыхтаванай супрацоўнікамі бібліятэкі. Экспазіцыя знаёміць з найбольш грунтоўнымі і важнымі выданнямі, што пабачылі свет дзякуючы плённай працы супрацоўнікаў інстытута. Так, на выстаўцы можна пабачыць збор твораў Якуба Коласа ў 20-і тамах, поўны збор твораў Янкі Купалы ў 9-і тамах, збор твораў Максіма Танка ў 13-і тамах, збор твораў Івана Навуменкі ў 10-і тамах.

✓ **4 снежня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі Вячаслава Бандарэнкі «Полководцы и военачальники Первой мировой войны – уроженцы Беларуси»**, што выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Кніга распавядае пра генералаў-беларусаў, якія дасягнулі вышэйшых ступеняў адзнакі ў расійскай арміі ў 1914 – 1918 гг.

✓ **5 снежня быў адкрыты першы ў Беларусі помнік паэту Максіму Танку**, створаны па праекце скульптараў Івана Міско і Аляксандра Фінскага, а таксама архітэктара Армена Сардарава. Ён усталяваны ў Мядзелі на плошчы Шаранговіча і ўяўляе сабою бронзавую фігуру паэта на гранітным пастаменце. Непадалёк размешчаны валун з картушам у выглядзе раскрытай кнігі, дзе выбітыя словы з верша Максіма Танка: «Ёсць адна песня песняў – пра Радзіму».

✓ **8 снежня** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адкрылася **персанальная выстаўка Міхаіла Буліча «Архімары»** з серыі «Этнаграфія гарадскога мастацтва». Выстаўка стала спробай даследаваць калектыўнае несвядомае з дапамогай творчасці дэвіянтнага мастацтва, магчымасцю распавесці пра каштоўнасць падобнага мастацтва не толькі грамадству, але і самім людзям, а таксама – зірнуць на свет крыху іншымі вачыма – больш памяркоўнымі, мудрымі і добрымі.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні...